■ Аты-баты

# ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ!

**Днямі вынікі ўступнай кампаніі падводзілі ў Інстытуце пагранічнай службы. Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, хто шукае для сябе нялёгкую долю ахоўніка дзяржаўнай мяжы.**

...Суботняй раніцай у актавай зале культурна-забаўляльнага цэнтра інстытута няма вольных месцаў. Амаль дзве сотні абітурыентаў разам са сваімі бацькамі прыехалі з усіх куткоў краіны і ў хваляванні чакаюць абвяшчэння вынікаў. З гэтых амаль дзвюх соцень на першы курс залічаць толькі 100. Яшчэ 4 чалавекі будуць вучыцца ў Калінінградскім пагранічным інстытуце.



Наступныя чатыры гады хлопцы будуць вучыцца самастойнасці.

— Папярэднія вынікі прыёмнай кампаніі нас задаволілі, — распачаў мерапрыемства **начальнік Інстытута пагранічнай службы, палкоўнік Васіль ГЕДЗЬКО.** — Па спецыяльнасці «Упраўленне падраздзяленнямі граніц» прахадны бал быў 152, «Упраўленне падраздзяленнямі пагранічнага кантролю» — 166, па спецыяльнасці «Аператыўная дзейнасць органаў пагранічнай службы» — 141 і «Ідэалагічная работа ў органах пагранічнай службы» — 143 балы.

Пачалося абвяшчэнне прозвішчаў тых, хто атрымаў чаканае месца на студэнцкай (ці, лепш сказаць, курсанцкай) лаве. Залішняй эмацыянальнасці, скокаў і радасных крыкаў тут не было — хлопцы быццам бы пацвярджалі сваю прафпрыгоднасць і стрымана ўсміхаліся, паціскалі рукі бацькам, абдымалі матуль. З іншага боку, слёз тых, хто не паступіў, мы таксама не заўважылі. Ды ім і няма чаго гараваць — шлях на атрыманне адукацыі памежніка не закрываецца. Калі для іншых абітурыентаў войска нярэдка становіцца галаўным болем, то гэтым хлопцам яно толькі дапаможа: маладыя людзі могуць праходзіць пагранічную службу па кантракце, а праз год вярнуцца ў Інстытут з рэкамендацыяй і высокімі адзнакамі ў атэстаце па экзаменацыйных прадметах (адной з дзяржаўных моў, матэматыцы і гісторыі). Такія абітурыенты будуць залічвацца ў інстытут па-за конкурсам. Акрамя таго, калі за першы месяц навучання з'явяцца і першыя адлічаныя, на іх месцы заступяць тыя, хто не прайшоў па балах.

— Сёлета мы ўпершыню набіралі абітурыентаў на чатыры новыя спецыяльнасці, — распавядае **першы намеснік начальніка Інстытута пагранічнай службы, палкоўнік Сяргей ВОЛКАЎ.** — Таму, безумоўна, адчувалі пэўнае хваляванне. Але вынік атрымаўся добры — прахадны бал заўважна вырас у параўнанні з мінулымі гадамі. Шмат абітурыентаў паступала па-за конкурсам: выпускнікі Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча з сярэднім балам атэстата не ніжэй за 7, выпускнікі кадэцкіх вучылішчаў і салдаты, якія праходзяць тэрміновую службу з не ніжэйшым за 6 балам па экзаменацыйных прадметах.

Ужо 31 ліпеня наваспечаныя курсанты прыбудуць у інстытут. Праз 2 дні яны накіруюцца ў вучэбны цэнтр пад Смаргонню, дзе іх чакае курс маладога байца, а напрыканцы жніўня прымуць прысягу на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Потым — чатыры гады старannай вучобы.

Але курсанцкае жыццё пачынаецца для іх ужо сёння. Акрамя традыцыйнага запаўнення анкет і афармлення дакументаў, хлопцаў чакае шэраг «сакральных» працэдур, напрыклад абмерка. У фае будынка ўсталявана мінілабараторыя для зняцця антрапаметрычных паказчыкаў. Ужо 31 ліпеня курсанты атрымаюць некалькі камплектаў новай формы. З жартам пытаемся ў супрацоўнікаў, ці моцна худзеюць курсанты за час навучання. Аказваецца, зусім наадварот — набіраюць вагу, але месца тлушчу займаюць мышцы.

Увогуле, варта сказаць, што навучэнцаў тут забяспечваюць усім неабходным. З асабістых рэчаў ім нічога не спатрэбіцца — усё дае дзяржава. Але патрабуюць адпаведных адносін

— Цяпер абітурыенты (ці, можна смела сказаць, — будучыя курсанты) запаўняюць паперы для атрымання грашовага забеспячэння, — кажа **намеснік начальніка аддзела кадраў і ўліку асабовага складу, падпалкоўнік Юрый КАЛЯДА.** — На першым курсе яны будуць атрымліваць 1,8 мільёна рублёў. Таксама заключаем кантракты на час навучання і пяць гадоў службы на афіцэрскіх пасадах пасля яго завяршэння. У кантракце прапісаны абавязкі бакоў, у тым ліку — умовы датэрміновага скасавання. Калі курсанта адлічваюць з інстытута, яму даводзіцца пакрываць выдаткі дзяржавы на падрыхтоўку.



Будучы курсант Уладзіслаў Шпакоўскі са сваёй сям'ёй.

У сярэднім навучанне аднаго афіцэра-пагранічніка каштуе дзяржаве прыкладна 150 мільёнаў рублёў за год. Таму, калі курсант будзе адлічаны, напрыклад, з другога курса, вяртаць прыйдзецца ўжо 300 мільёнаў. Неблагая матывацыя старанна вучыцца і трымаць дысцыпліну.

Але тут не імкнуцца кагосьці напужаць. Наадварот, пра тое, што чакае будучых курсантаў, можна адразу даведацца ў старшакурснікаў, якія выконваюць ролю своеасаблівых «гідаў».

— Мы кансультуем абітурыентаў па ўсіх пытаннях, — расказваюць **чацвёртакурснікі Яўген ТРАЯН і Аляксандр КЕРНАЖЫЦКІ.** — Пытанні самыя розныя, ад «Што з сабой узяць?» і «Ці націраюць берцы?» да «Ці цяжка тут увогуле вучыцца?». Яшчэ адно распаўсюджанае пытанне датычыцца мабільных тэлефонаў, але адказ просты — карыстацца можна толькі ў вольны ад вучобы час. Асабліва хвалююцца не столькі будучыя курсанты, колькі іх бацькі. Насамрэч перажываць няма чаго — наперадзе хлопцаў чакае самае цікавае: першыя заняткі, паездкі ў цікавыя месцы. Галоўнае, што павінен мець курсант — гэта патрыятызм: калі ён ёсць — усё атрымаецца.

**Аляксандр ПРАНЕВІЧ** прыехаў у Мінск з Драгічына. Сёлета Інстытут пагранічнай службы закончыў яго старэйшы сын, малодшы пайшоў па тым жа шляху і таксама выбраў гэту ВНУ.

— Безумоўна, мяне перапаўняе гонар за сваіх дзяцей, — дзеліцца мужчына. — У нас у сям'і не было вайскоўцаў, але мы заўсёды казалі хлопцам, што афіцэр — гэта прыклад маральнай чысціні, дысцыпліны, можа, таму яны і выбралі такую будучыню. Калі меркаваць па старэйшым сыне, то яго вучоба змяніла вельмі моцна. Ён стаў больш адказным, больш сур'ёзным, ну і, вядома, больш мужным. Чакаем такіх жа змен і ад малодшага.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Падрыхтоўка да вучобы пачынаецца ўжо сёння.

«У мяне ў сям'і шмат вайскоўцаў, — кажа **будучы курсант Уладзіслаў ШПАКОЎСКІ.** — Таму з дзяцінства я на свае вочы бачыў, што сабой уяўляе служба. І выбар, чым заняцца пасля школы, зрабіць было няцяжка. Дзядуля служыў пагранічнікам, таму я працягваю дынастыю. Ад вучобы і службы чакаю ў першую чаргу набыцця новых прафесійных якасцяў і паспяховай кар'еры. Гэтага ж хочуць і мае родныя.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

**Яшчэ больш фота на сайце zviazda.by**

# Надыхацца вішнёвым водарам

**Ці чулі вы, што ў горадзе Глыбокае знаходзіцца магіла і помнік Мюнхгаўзену? Ці то цёзкі, ці то сваяка гэтага легендарнага персанажа. Здаецца, ён вось-вось ажыве і вылеціць са сваёй гарматы, гледзячы ў падзорную трубу. Яшчэ адным упрыгажэннем горада з'яўляецца помнік вішні. Кажуць, калі дакрануцца да апетытнай ягады, а потым абысці вакол яе — збудзецца самае запаветнае жаданне...**




У Глыбокім ёсць на што паглядзець і чаму падзівіцца, асабліва падчас Вішнёвага фестывалю, які праходзіць у горадзе трэці раз. У 2012 годзе глыбачане з ідэяй аб правядзенні «ягаднага фэсту» занялі другое месца на III міжнародным форуме «Імідж Беларусі: час дзейнічаць.» І пайшло-паехала.

Напярэдадні першага фестывалю, два гады назад, пры ўездзе ў горад пасадзілі 1414 саджанцаў вішні (менавіта ў 1414 годзе Глыбокае ўпершыню згадваецца ў летапісах), а вуліцу насупраць саду сталі называць Вішнёвай. А сёлета на ўездзе ў горад з'явіўся знак, які «вітае» ўсіх, хто накіроўваецца ў горад па трасе Паставы — Полацк. Выкананы ён у форме сцяны-крэпасці, на якой яшчэ здалёк відаць надпіс «Глыбокае», дата яго першай пісьмовай згадкі ў дакументах і герб горада.

Адзначу, што сад квітнее, на вуліцы Вішнёвай з'яўляюцца новыя дамы, а ў цэнтры горада штогод падчас фэсту ладзяцца выставы, кірмашы, дыскатэкі, тэатралізаваныя паказы, спартландыі, майстар-класы, разнастайныя форумы.

З раніцы ў гандлёвым цэнтры «Родны кут» было людзей столькі, што носа не ўбіць. «Што дзеецца?» — пытаюся я і чую ў адказ голас з натоўпу: — «Ды мы тут вішнёвымі вырабамі частуемся». Праціснуўшыся бліжэй, заўважаю караваі, піражныя, тарты (такія прыгожыя, ажно есці шкада). Перада мною былі сапраўдныя кулінарныя шэдэўры з вішнёвым каларытам. Прымяненне галоўным ягадам горада знайшлі не толькі ў райспажыўтаварыстве. На мясцовым малочнакансервавым камбінаце ўжо некалькі гадоў выпускаюць сваю «вішнёвую» згушчанку з араматам шэры-брэндзі.

Пакуль у гандлёвым цэнтры ласаваліся вішнёвымі прысмакамі, у райвыканкаме віталі гасцей фестывалю з Грузіі, Германіі, Латвіі, Літвы, Ізраіля, Расіі, Польшчы. У афіцыйнай частцы мерапрыемства адбылося падпісанне дамоўленасцяў і пратаколаў аб супрацоўніцтве, у неафіцыйнай былі віншаванні, падарункі, словы падзякі. На думку **старшыні Глыбоцкага райвыканкама Алега МОРХАТА,** вішнёвы фестываль мае сваю непаўторную атмасферу, форму, сэнс, змест і каларыт:

— Свята ўмацоўвае дружбу і супрацоўніцтва паміж краінамі і народамі свету, а таксама дае магчымасць бліжэй пазнаёміцца з культурнымі і духоўнымі традыцыямі Глыбокага. Асаблівы змест Вішнёваму фестывалю надае і тое, што ён праводзіцца ў цудоўным горадзе з шасцісотгадовай гісторыяй, прыгожымі архітэктурнымі помнікамі і гасціннымі, добразычлівымі жыхарамі. Наш фэст — пляцоўка для творчых людзей. Тут праяўляюць свае таленты і паэты, і кампазітары, і кулінары, і вінаробы. А мы спрыяем гэтаму і ствараем усе неабходныя ўмовы. Вішнёвы фестываль таксама дапамагае знайсці нам час для размоў і стварэння «душэўнага» дыялогу і з нашымі замежнымі гасцямі. Свята ўсіх нас аб'ядноўвае, дае сілы і штуршок дзеля далейшых працоўных дасягненняў. Магчыма, у будучыні ў нас з'явіцца музей вішні. А сёння мы маем выдатны ўраджай гэтых ягад, здавалася, вясна была халодная, але глыбоцкая вішня выстаяла, таму што яна ў нас асаблівая.

Не магу не пагадзіцца са словамі Алега Віктаравіча: ягады тут сапраўды цудоўныя: сакавітыя, смачныя, салодкія. Увогуле горад паўстае перад вачыма, як вялікі вішнёвы сад. Амаль на кожным падворку растуць дрэвы, упрыгожанныя чырвона-барвовымі пладамі. Сустракаеш іх і каля звычайных хатак, і каля шматпавярховікаў. Дарэчы, па ягады ў гасцінны горад прыязджаюць з Полацка, Мінска, Віцебска, бо глыбоцкія вішні ўжо паспелі стаць брэндам. А гараджане кажуць пакупнікам з усмешкай, што костачка ў вішань незвычайная, маўляў, рассмоктваецца сама.

Я запыталася, як на смак нашы вішні гасцям з замежжа. Паўль і Таццяна Томшке з Германіі адзначылі — ягады цудоўныя! Паважаныя госці ўжо не першы раз прыязджаюць у вішнёвую сталіцу Беларусі і зазначаюць, што фестываль адметны, надзвычайны!

Зычу гасцям з Германіі цікавага адпачынку, кажу «данке шон» ды накіроўваюся глядзець на святочнае шэсце «У каралеўстве вішань». Перад шматлікай публікай з'яўляецца шыкоўная «залатая» карэта, з якой у пышным бардова-чырвоным строі выходзіць прыгажуння-вішня. Як сапраўдная каралева, на правах гаспадыні яна вітае ўсіх удзельнікаў фестывалю. Асаблівую ўвагу Яе вялікасць удзяліла дзвюм маладым сем'ям. Як высветлілася, два гады таму ў такі ж сонечны дзень вішнёвага фэсту ў іх было вяселле. А на сённяшнім святке яны ўжо прысутнічаюць са сваімі дзеткамі. Вось такая спрыяльная аўра фестывалю.

Ад **Наталлі КРУПСКАЙ, начальніка раённага вузла паштовай сувязі,** я даведалася, што сёння ў гонар свята адбылося гашэнне спецыяльнай паштовай маркі.

— Міністэрства сувязі таксама ўважліва паставілася да правядзення свята і з гэтай нагоды выпусціла ў свет памятны штэмпель, і мы правялі ўрачыстую цырымонію гашэння паштовай маркі. Гэта падарунак Глыбокаму ад «Белпошты». Мы будзем рабіць усё магчымае, каб сувязь паміж жыхарамі нашага горадам і гасцямі з замежжа з дапамогай нашай кампаніі ўмацоўвалася яшчэ больш, — расказала Наталля Крупская.

Накупляўшы сувеніраў, паштовак, удосталь наласаваўшыся вішнямі, я паехала дадому адпачываць. А горад проста «забыўся» на гэта слова. Каралева-вішня запрасіла ўсіх да галоўнай сцэны і паабяцала, што музыка, спевы і вяселле не сціхнуць тут аж да ночы.

Надвор'е спрыяла, і віхор фестывалю гарантаваў кружыць у святочным карагодзе ажно да першых зорак.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**

# КОНКУРС... НА ЗВАННЕ РЭКТАРА

**У Беларусі плануецца стварыць Нацыянальнае адукацыйнае агенцтва. Пра гэта на семінары кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Беларусі паведаміў міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

Кіраўнік ведамства звярнуў увагу дыпламатаў на тое, што адукацыйныя паслугі — адзін з найважнейшых сегментаў эканомікі краіны. Таму трэба весці больш актыўную, часам нават агрэсіўную піяр-палітыку ў сферы прыцягнення ў Беларусь абітурыентаў з іншых краін. З гэтай мэтай і плануецца стварыць Нацыянальнае адукацыйнае агенцтва, якое будзе ўзаемадзейнічаць з усімі дыппрадстаўніцтвамі Беларусі ў іншых краінах. Сёння ў нашай краіне навучаюцца больш як 18 тысяч замежных студэнтаў, пераважна з Туркменістана, Кітая, Расіі. Па словах Міхаіла Жураўкова, трэба пашыраць геаграфію экспарту адукацыйных паслуг.

Міхаіл Жураўкоў агучыў таксама яшчэ адну важную навіну: з верасня 2015 года ў краіне плануецца ўкараніць сістэму выбарнасці рэктараў ВНУ. Кандыдат у рэктары павінен будзе падаць у савет універсітэта сваю праграму дзеянняў. Савет, у сваю чаргу, будзе разглядаць усе прадстаўленыя праграмы кандыдатаў. Лепшыя з іх будуць зацвярджацца саветам і падавацца ў Міністэрства адукацыі. Кандыдаты павінны будуць распрацаваць праграму, якая паспрыяе развіццю іх ВНУ ва ўсіх сферах, у тым ліку ў адукацыйнай, матэрыяльна-тэхнічнай і навуковай.

Міністр нагадаў, што Беларусь шырока ўключана ў міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі. У краіне дзейнічаюць больш як 90 міжнародных дагавораў у сферы адукацыі, навукі і маладзёжнай палітыкі. А ў маі гэтага года ў Ерэване адбылася канферэнцыя міністраў адукацыі дзяржаў — удзельніц Балонскага працэсу, па выніках якой Беларусь аднагалосна была прынятая ў еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі ў якасці 48-га ўдзельніка Балонскага працэсу.

Выбарнасць рэктараў — адно з пажаданняў з боку краін-удзельніц пры мадэрнізацыі вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Для краін Балонскага працэсу, якія спрабуюць уліцца ў еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі, распрацоўваюцца так званыя дарожныя карты. Такая ж карта распрацавана і для Беларусі. У нашай краіне плануецца ўдасканаліць нацыянальную сістэму кваліфікацый, сумясціўшы яе з еўрапейскай, правесці структурныя рэформы для паляпшэння акадэмічнай мабільнасці студэнтаў, а таксама здзейсніць іншыя крокі, скіраваныя на павышэнне якасці адукацыі.

# Адукацыйная арыфметыка

## Платная адукацыя даражэе толькі для першакурснікаў

**Кошт навучання па раней заключаных дагаворах для студэнтаў ВНУ і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў II-V курсаў з 1 верасня не зменіцца. Аб гэтым афіцыйна паведаміла прэс-служба галоўнага адукацыйнага ведамства.**

«У дзяржаўных установах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі кошт навучання на платнай аснове, устаноўлены з 1 верасня 2014 года, заставаўся нязменным на працягу 2014/2015 навучальнага года, хоць у гэты перыяд павышаўся ўзровень заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый, а таксама адбываўся рост тарыфаў на камунальныя паслугі і паслугі сувязі», — падкрэсліваецца ў паведамленні.

Цэны на навучанне на платнай аснове ў дзяржаўных установах адукацыі вызначаюцца зыходзячы з неабходных выдаткаў на падрыхтоўку спецыяліста па канкрэтнай спецыяльнасці. У адпаведнасці з заканадаўствам, ВНУ і ССНУ заяўляюць з 1 верасня 2015 года кошт навучання для студэнтаў 1 курса з улікам дзеючага памеру тарыфнай стаўкі першага разраду, устаноўленай для работнікаў бюджэтных арганізацый, узроўню цэн і тарыфаў на камунальныя паслугі і паслугі сувязі па стане на 1 ліпеня 2015 года.

Улічваючы сацыяльную важнасць падрыхтоўкі тых ці іншых спецыялістаў на платнай аснове, на падставе заяў грамадзян кіраўнікі дзяржаўных устаноў адукацыі могуць спаганяць плату за навучанне з адтэрміноўкай або растэрміноўкай плацяжу.

Міністэрства адукацыі звяртае ўвагу кіраўнікоў устаноў адукацыі на персанальную адказнасць за неабгрунтаванае павышэнне кошту навучання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Рэкорды прыёмнай кампаніі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Найбольш актыўна маладыя людзі падавалі дакументы на юрыдычны профіль адукацыі. Магчыма, гэта звязана з тым, што матэматыка на ўступных выпрабаваннях была заменена на замежную мову, з якой гуманітарыям справіцца значна лягчэй. Конкурс для будучых правазнаўцаў вырас у гэтым годзе да 2,8 чалавека на месца.

### ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН — У ЛІДАРАХ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце на некаторых спецыяльнасцях сёлета зафіксаваны проста фантастычныя прахадныя балы. На спецыяльнасці «міжнароднае права» — 383, «міжнародныя адносіны» — 378, на «сусветнай эканоміцы» — 367, на спецыяльнасці «эканамічнае права» — 362, «менеджмент (напрамак — менеджмент у сферы міжнароднага турызму)» — 358. На спецыяльнасці «лінгвакраіназнаўства» было выдзелена ўсяго 8 бюджэтных месцаў, а прахадны бал склаў 377 (у 2014 годзе — 361). На спецыяльнасць «мытная справа» залічана 18 абітурыентаў. Прахадны бал — 357 (у 2014 годзе — 340).

На спецыяльнасцях эканамічнага факультэта прахадны бал склаў 343 (у 2014 годзе — 315): «менеджмент (напрамкі — міжнародны менеджмент, інавацыйны менеджмент)» — 359; «фінансы і крэдыт» — 358; «эканамічная інфарматыка» — 352; «эканоміка» — 350; «эканамічная тэорыя» — 343.

Усе вышэйпералічаныя спецыяльнасці традыцыйна былі ў моладзі вельмі запатрабаваныя, таму назваць нечаканасцю высокія прахадныя балы на іх можна толькі з нацяжкай. Затое вельмі парадавалі прыёмную камісію абітурыенты, якія паступалі на прыродазнаўчыя факультэты і факультэты дакладных навук.

Так, на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі па аб'яднаным конкурсе было залічана 276 абітурыентаў, а прахадны бал склаў 300 (у 2014 годзе — 189). Сярод залічаных 31 пераможца Рэспубліканскай алімпіяды і 2 лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прахадныя балы па спецыяльнасцях і напрамках выглядаюць наступным чынам: «прыкладная інфарматыка (напрамак — праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм)» — 357; «актуарная матэматыка» — 354; «інфарматыка» — 344; «камп'ютарная бяспека (напрамак — матэматычныя метады і праграмныя сістэмы)» — 342; «эканамічная кібернетыка» — 331; «прыкладная матэматыка» — 300.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій: «камп'ютарная бяспека (напрамак — радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі)» — 288; «прыкладная інфарматыка (напрамак — інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм)» — 272.

На спецыяльнасці хімічнага факультэта залічана 140 абітурыентаў, сярод іх 12 чалавек залічаны без экзаменаў. На спецыяльнасць «хімія лекавых злучэнняў» прахадны бал склаў 356 (у 2014-м — 334), «хімія высокіх энергій» — 319.

### БРЭСЦКІЯ І ГРОДЗЕНСКІЯ ВНУ ЎКАМПЛЕКТАВАЛІСЯ ЦАЛКАМ

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы — адна з нямногіх ВНУ краіны, якой Міністэрства адукацыі захавала колькасць бюджэтных месцаў у параўнанні з папярэднім годам. І ўніверсітэт апраўдаў аказаны давер, справіўшыся з планам прыёму: конкурс на бюджэтную дзённую форму навучання вагаўся ад 1,1 чалавека на месца (на спецыяльнасці «выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка») да 6,4 чалавека на месца (на групе спецыяльнасцяў «правазнаўства», «эканамічнае права» і «міжнароднае права»). Набор у гэтым годзе ажыццяўляўся па 51 спецыяльнасці. Абітурыентка з самым высокім балам (383) падала дакументы на спецыяльнасць «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый». Чатыры абітурыенты, якія паступаюць у ГрДУ імя Янкі Купалы, атрымалі 100 балаў па прадметах ЦТ. У ліку абітурыентаў таксама пераможцы розных этапаў рэспубліканскіх алімпіяд і 120 абітурыентаў, якія скончылі навучальныя ўстановы з залатым медалём або дыпломам з адзнакай. Агульны конкурс па ўніверсітэце склаў 2,1 чалавека на месца.

У Гродзенскім аграрным універсітэце на 405 бюджэтных месцаў пададзена 573 заявы, агульны конкурс склаў 1,4 чалавека на месца.

Найбольш высокі конкурс склаўся традыцыйна на эканамічных спецыяльнасцях («эканоміка і арганізацыя ў галінах АПК» — 3,5 чалавека на месца, «менеджмент» — 4, «бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт» — 2,5, «фінансы і крэдыт» — 2,4), а таксама на спецыяльнасцях «тэхналогія захоўвання і перапрацоўкі збожжа» — 1,9, «тэхналогія мяса і мясных прадуктаў» — 1,6.

Агульны конкурс у Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце склаў 1,5-2 чалавекі на месца ў залежнасці ад спецыяльнасці. Абітурыент з самым высокім балам — 376 — стане першакурснікам лячэбнага факультэта.

Паспяхова праходзіць прыёмная кампанія і на Брэстчыне: праводзіць дадатковы набор абітурыентаў на вакантныя бюджэтныя месцы ва ўніверсітэтах вобласці не плануецца. Ва ўсіх ВНУ рэгіёнаў яны запоўнены на 100%.

Так, у Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт падалі дакументы 1 тыс. 564 чалавекі. Прычым 774 абітурыенты прэтэндуюць на атрыманне вышэйшай адукацыі на дзённай бясплатнай форме. Але бюджэтных месцаў сёлета выдзелена толькі 555. Найбольшай папулярнасцю ў тых, хто паступае, карыстаецца спецыяльнасць «лагістыка». Крыху менш маладых людзей выказалі жаданне працягнуць навучанне па напрамку «меліярацыя і водная гаспадарка» і «праграмаваныя мабільныя сістэмы».

У Брэсцкім дзяржаўным універсітэце ім А. С. Пушкіна на бюджэт плануецца залічыць 455 чалавек, у той час як дакументы падалі ў два разы больш абітурыентаў — 915. Шмат медалістаў, пераможцаў і прызёраў прадметных алімпіяд скарысталіся магчымасцю паступіць без іспытаў. У гэтым годзе ў абітурыентаў аказалася вельмі запатрабаванай спецыяльнасць «фізічная культура» — там конкурс перавысіў тры чалавекі на месца. Ужо вядома, што на першым курсе будуць вучыцца вядомыя спартсмены: чэмпіёны і прызёры рэспубліканскіх і міжнародных першынстваў і кубкаў.

Усе бюджэтныя месцы запоўнены і ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце. Традыцыйна высокі конкурс склаўся на псіхолага-педагагічным факультэце, а таксама на факультэце эканомікі і права.

У Палескім дзяржуніверсітэце ад абітурыентаў прынята 868 заяў на бюджэт. А атрымліваць вышэйшую адукацыю на бясплатнай форме змогуць толькі 475 маладых людзей. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца эканамічныя спецыяльнасці.

### БУДУЧЫМ ГЕОЛАГАМ СПАТРЭБІЦЦА ГЕАГРАФІЯ

Прыёмная кампанія 2016 года яшчэ не завяршылася, але ўжо сталі вядомыя нюансы будучай прыёмнай кампаніі. Міністэрства адукацыі перагледзела пералік уступных выпрабаванняў для некаторых спецыяльнасцяў і напрамкаў падрыхтоўкі і змяніла прыярытэты. Першым профільным прадметам для інжынерных спецыяльнасцяў, падрыхтоўка па якіх вядзецца ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях, падрыхтоўка па якіх вядзецца ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце, а таксама па спецыяльнасці «Праграмаваныя мабільныя сістэмы» (у БДУІР) вызначана матэматыка, другім — фізіка.

У 2015 годзе па названых спецыяльнасцях першым профільным прадметам была фізіка, матэматыка — другім.

Па спецыяльнасцях «Дакументазнаўства» (па напрамках), «Гісторыя» (па напрамках), «Музейная справа і ахова культурна-гістарычнай спадчыны» (па напрамках), «Гісторыка-архівазнаўства» прадметам першага профільнага іспыту вызначана гісторыя Беларусі, другім — сусветная гісторыя найноўшага часу (у 2015 годзе першым профільным выпрабаваннем па гэтых спецыяльнасцях была сусветная гісторыя найноўшага часу, другім — гісторыя Беларусі). Па спецыяльнасці «Дакументазнаўства (дакументацыйнае забеспячэнне кіравання)» у 2015 годзе першым профільным прадметам была матэматыка, другім — замежная мова.

Першым профільным прадметам па спецыяльнасці «Геаінфармацыйныя сістэмы (па напрамках)» зацверджана геаграфія, другім — фізіка. У 2015 годзе другім профільным прадметам уступнага выпрабаванні была матэматыка.

Першым профільным прадметам па спецыяльнасці «Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў» зацверджана геаграфія, другім — фізіка. У 2015 годзе першым профільным прадметам была фізіка, а другім — матэматыка.

Па зноў уведзенай спецыяльнасці «Судовыя крыміналістычныя экспертызы» прадметам першага профільнага іспыту зацверджана грамадазнаўства, другім — замежная мова.

А на спецыяльнасць «Турызм і прыродакарыстанне» (падрыхтоўка вядзецца ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце) абітурыенты цяпер будуць здаваць геаграфію (першы профільны прадмет) і матэматыку (другі).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*